УДК 338.48:502

Н.І. Здановіч, ст. выкл.
NinaZdan@tut.by (БДТУ, г. Мінск, Беларусь)

# ВОБРАЗЫ ЖЫВЕЛ У БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ І МАГЧЫМАСЦІ ІХ ВЫКАРЫСТАННЯ Ў ЭКАЛАГІЧНЫМ ТУРЫЗМЕ

Чалавек заўсёды пільна назіраў за жывёльным светам. Вынікам такіх назіранняў стала дакладная характарыстыка знешняга выгляду, паводзін і якасцяў жывёл. У народнай традыцыі менавіта гэтыя рысы сталі асновай для трапнай характарыстыкі чалавека – праз прыём параўнання з адпаведнымі якасцямі, знешнім відам ці паводзінамі жывёл. Толькі зрэдку гэтыя параўнанні датычацца іншых з'яў (напрыклад: "улетку ноч як у зайца хвост").

Класіфікацыя параўнанняў – справа няпростая найперш па той прычыне, што яны вельмі разнастайныя па змесце і ўзнікаюць стыхійна, у залежнасці ад сітуацыі. Не выклікае сумненняў толькі ідэя пра тое, што ўсе параўнанні ў залежнасці ад зместу выразна можна падзяліць на 2 групы: "сур'ёзныя" і жартоўныя [1, с. 22]. Наша даследаванне прысвечана толькі адной іх групе, якая датычацца сувязей паміж чалавекам і светам жывёл.

Аналіз параўнанняў дазволіў падзяліць іх на некалькі асобных блокаў.

1. Параўнанні, звязаныя са знешнім выглядам чалавека. Гэта самая шматлікая група параўнанняў [1, с. 291-423].

Найперш, яны датычацца рысаў твару. Вядомы выраз "вочы-люстэрка душы". І яны, паводле фальклору, маглі быць " як у рыбы", ці "як у савы" (ці ў свінні). Адрозная і форма носа: "нос як у дзятла", ці "нос як у качкі". Дасталося і зубам: "зубы як у бабра" ці "зубы як у шчупака". З яўнай антыпатыяй да чалавека прыдуманы параўнанні "рот як у воўка", "вушы як у зайца", ці "вусы як у рака". А вось даўгашыіх параўноўвалі ў залежнасці ад ўражання, якое іх выгляд рабіў на акаляючых: "шыя доўга як у бусла", ці – "як у лебедзя". Аказваецца, чалавек можа быць "лысы як барсук", ці на галаве могуць расці "валасы як на вожыку".

Самыя разнастайныя параўнанні датычыліся камплекцыі чалавека. Пра поўнага мужчыну маглі сказаць, што ён "тлусты як барсук" ці "тоўсты як бабёр". Яшчэ больш разнастайна характарызавалі хударлявых людзей: пра мужчыну казалі, што ён "плоскі як лешч" , ці "худы як вясновы грак". А вось пра высокую жанчыну – "худая як чапля". Высокага мужчыну параўноўвалі з буслом ці жураўлём ("цыбаты як бусел" ці "цыбаты як жураўель"). Пра невысокага

хлопца замест крыўднага “кардупель” маглі сказаць жартаўлівае “пайшоў у рост як заяц у хвост”.

Выразы “валюхаецца, як вутка”, “кацалапы як мядзведзь” ці “ходзіць як бусел ля вады” трапна характарызавалі паходку.

Пра прыгожую зграбную дзяўчыну казалі, што яна “як лань” ці “прыгожая, як краснапёрачка”, а пра хлопца – “статны як лось”.

2. Параўнанні, звязаныя з характарам чалавека.

Чалавека, які мог высці з любой складанай сітуацыі, найчасцей параўноўвалі з рознымі відамі рыб ці з паўзунамі: казалі, што ён “вёрткі, як уюн”, “круціцца як вуж”. А вось пра чалавека, з якім лепш было не мець справу, казалі, что ён “слізкі што ўюн” ці “гідкі (праціўны) як кажан”. Пра недаверлівую жанчыну казалі, што яна “асцярожна як стронга”, а пра хцівага мужчыну – “прыкрадаецца як воўк”.

Моцна дасталося аматаркам пакрычаць ды пасварыцца. Пра такіх жанчын казалі “гарланіць як варона”, “крычыць як варона на дождж”, “шчабеча як сарока” (чачотка, салавей з зязюляй). Пра мужчын казалі “балбоча як удод” (як цецярук), а калі са злосцю – то “раве як мядзведзь”.

Калі чалавек злуецца за нешто і не жадае па нейкай прычыне з кімсці размаўляць, пра яго казалі “дзьмецца як індык”, “надуўся як сава”, “маўчыць як сыч”, “натапырыўся як вожык”, “маўчыць як рыба ў вадзе”, ці “заняло як жабе зімою”.

3. Параўнанні, звязаныя з асобнымі якасцямі чалавека.

А) Сіла ці слабасць.

Дужага чалавека звычайна параўноўвалі з самымі моцнымі звярамі, вядомымі беларусам: “дужы як мядзведзь” (як зубр, як тур). І наадварот – ўвасабленнем слабасці і безабароннасці быў верабей. Адсюль выразы: “сілы як у вераб’я”, “узяў як верабей”.

Б) Спрытнасць.

Пад гэтым тэрмінам разумеюцца самыя розныя чалавечыя якасці і здольнасці – найперш здольнасць своечасова і хутка рабіць усе справы лепш за іншых. Гэта азначае – валодаць нейкімі выключнымі здольнасцямі. Пра спрытнага чалавека, у залежнасці ад сітуацыі, кажуць: “жвавы як верабейка”, “спрытны як вавёрка” (заяц, качка на вадзе, лось), “бачыць як птушка”, “бяжыць, як сарна”, “спіць як заяц” (у сэнсе вельмі чуйна).

В) Нязграбнасць.

Гэта антыпод спрытнасці. Такія параўнанні павінны былі стаць стымулам для чалавека, каб паспрабаваць стаць лепшым, у нечым удасканаліцца. Пра “маруду” казалі, што ён “паўзе як вусень (смоўж,

чарапаха)” [1, с. 363], а пра няўклюднага чалавека – "скача як мядзведзь”.

Г) Хуткасць.

Чалавека, які добра бегаў, параўноўвалі з рознымі відамі звяроў ці з рыбамі: “прэ як заяц”, “носяцца як ласі”, “хуткі што стронга”, “сігануў што стронга”, “уцякае як заяц ад сабакі”, “мчыцца як той бусел з жабай”.

Д) Сквапнасць.

Гэта рыса чалавечага характару асацыюецца толькі з адной жывёлай – ваўком (“хапае як воўк”). Праўда, яна можа быць і следствам чалавечай слабасці, што праглядаецца ў параўнанні “ласы як мядзведзь на мёд” ці “хочацца як мядзведзю мёду”.

Е) Адмоўныя якасці.

Яны датычацца як знешняга выгляду, так і паводзін чалавека, а таксама сітуацый. Гэта параўнанні-кпіны. Менавіта гэтыя параўнанні мелі найбольшае выхаваўчае значэнне. Пра няўклюду гаварылі “згорбіўся як мядзведзь скачучы”, “непаваротлівы як мядзведзь” “нязграбны як жаба”. Калі ж хто браўся не за сваю справу, маглі сказаць “пяе як воўк вые”, “лезе як жаба на купіну”. Праўда, зрэдку казалі наўпрост “дурны як цецярук”, “п’е як рыба” (пра п’яніцу), ці “шкодны як тхор”. Пра чалавека, які надакучыў сваімі візітамі, казалі “унадзіліся як вераб’і ў проса”.

Многія параўнанні маюць адваротны сэнс. Гэта параўнанні-парадоксы, якія найчасцей характарызуюць сітуацыю: “патрэбен як рыбе парасон”, “схаваўся як лісіца пад барану”, “смелы як заяц”, “весела, як рыбцы на кручку”, “вольны як рыба ў нераце”, “трэба як воўк на небе”, “баіцца як воўк казы”.

4. Цікавыя параўнанні звязаны са складанай жыццёвай сітуацыяй: “абставілі як ваўка ў логаве”, “звыкся з бядою як рыба з вадою”, “заскачаш як рыба на кручку”, “адна як зязюлька”. Беднасць і нястача таксама знаходзілі адлюстраванне ў параўнаннях: “ежа як у птушкі”, “есці як верабейку”, “есць хочацца як Воўку”.

5. Свабода і шчасце.

Яны асацыююцца з птушкамі ці з існаваннем ў роднай стыхіі: “вольны як птушка”, “гадуецца як заяц у капусце”, “прыволле як бабру на возеры”, “раскоша як шчупаку ў возеры”, “сядзіць як заяц у жыце” (жаба на купіне, барсук у нары).

6. Нечаканыя сітуацыі.

Калі здараецца нешта “знянацку”, чалавек рэагуе на гэта па-рознаму. Сітуацыі адпавядаюць выразам: “вылупіў вочы як баран на

воўка”, “выскачыў як жаба з куста”, “падхапіўся як заяц з-пад купіны”, ці наадварот – “прытаіўся як зайчык пад мяжою”.

7. Пазначэнне колераў у фальклоры таксама падаюцца праз стойкія параўнанні: “рабенькі як дзяцел”, “зялёны як жаба”, “чорны як вуж” (грак, жук), “чырвоны як індык”, “шэрая як зязюлька”, “белы як лебедзь”, “сівы як голуб” (зайчык).

З разгледжаных параўнанняў праглядаюцца тыя якасці, з якімі асацыююцца розныя жывёлы. З птушкамі атаясамліваюць “гаварлівасць”, адчуванне свабоды, хуткасць, але і безабароннасць (верабей). Нязграбнасць, маруднасць, холад асацыююцца з жабамі, а хуткасць, спрытнасць і ізноў жа халоднасць – з рыбамі. Хрэстаматыйна вядомыя якасці зайца – палахлівасць, баязлівасць, асцярожнасць і хуткасць, таксама як непаваротлівасць і слабасць да мёда мядзведзя. З усіх капытных самым хуткім і статным лічыцца лось, а самаю зграбнаю – лань ці сарна. Ліс нязменна хітры, тхор – шкодны і з непрыемным пахам, а воўк – каварны і галодны.

Такім чынам, народны фальклор недарэмна называюць “бяздонным багаццем”. На працягу ўсяго існавання чалавека яго жыццё было знітавана са светам прыроды. На прадстаўнікоў жывёльнага свету пераносіліся чалавечыя якасці, экстрапаляваліся жыццёвыя сітуацыі. Так паступова адбывалася яго антрапамарфізацыя. Так параўнанні сталі своеасаблівай “эзопавай мовай” народа. Валоданне ёю аздобіць інфармацыю падчас прыродазнаўчых экскурсій, а пры умелым выкарыстанні дадасць каларыту і прывабнасці Беларусі ў вачах тых, хто будзе яе адкрываць падчас вандровак. Таму кожнаму народу трэба захоўваць сваю спадчыну “як жаваранку спяваць”.

ЛІТАРАТУРА

1. Выслоўі / Беларуская народная творчасць. Склад. М.Я. Грынблат. Мн.: Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.